Пролётарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 277 (346)
НЯДЗЕЛЯ
1
СНЕЖНЯ
1940 г.

Цана 10 капеек.

Сёння пачынаецца вучоба ў чыгуначных, рамесленых вучылішчах і школах фабрычна-заводскага абучэння.

ПАЛКІ ТРЫБУН РЭВОЛЮЦЫІ

Шэсць год назад — 1 снежня 1934 года—трацкісцка-зіноўеўска-бухарынскімі бандыдатамі быў зладзейска забіт Сергей Міронавіч Кіраў, палкі трыбун пролетарскай рэволюцыі, вялікі дзеяч комуністычнай партыі і соцыялістычнай дзяржавы, любімец совецкага народа, лепшы вучань і саратнік вялікага Сталіна.

Наша соцыялістычная радзіма, увесь совецкі народ і працоўныя ўсяго свету ніколі не забудуць светлы, крыштальна-чысты вобраз большэвіка Кірава. Памяць аб Кіраве будзе жыць у вяках.

Сергей Міронавіч Кіраў усё сваё жыццё аддаў на служэнне народу, вялікім ідэалам чалавецтва. З юнацкіх год Сергей Міронавіч Кіраў (Кострыкаў) стаў на шлях рэволюцыйнай барацьбы. У 1904 годзе Кіраў юнаком уступіў у большэвіцкую групу Томскай соцыял-дэмакратычнай арганізацыі. У годы рэакцыі, не гледзячы на арышты і праследванні паліцыі, ён вёў вялікую рэволюцыйную работу, падрыхтоўваў масы да рашаючых баёў з царызмам і буржуазіяй. У 1905 годзе Кіраў кіраваў забастоўкай чыгуначнікаў на станцыі Тайга. Пасля снежаньскага ўзброенага паўстання ў 1905 годзе, калі рэакцыя асабліва падняла галаву, Кіраў быў арыштаван. Праз некалькі месяцаў яму ўдаецца выйсці з турмы, і ён зноў прымаецца за рэволюцыйную дзейнасць. Але паліцыя зноў арыштавала яго, і толькі ў 1908 годзе Кіраў выходзіць з турмы.

1909—1917 годы Сергей Міронавіч працуе на Паўночным Каўказе. Тут ён аднаўляе работу большэвіцкіх арганізацый, з усёй энергіяй і страснасцю большэвіка змагаецца з меншавікамі, прымае актыўны ўдзел у рабоце советаў у дні Лютаўскай рэволюцыі.

Найвялікшы талент палкага трыбуна, арганізатара, змагара Кірава разгортваецца пасля Лютаўскай рэволюцыі. Сергей Міронавіч узначальвае арганізацыю владзікаўказскіх большэвікоў, шырока разгортвае прапагандысцкую работу, выкрывае здрадніцкую палітыку Часовага ўрада.

У дні Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі Кіраў знаходзіцца ў першых радах рэволюцыянераў у Петраградзе.

1918—1919 годы Сергей Міронавіч у Астрахані. Абарона Астрахані—гэта адна з найвялікшых эпапей у грамадзянскай вайне. У выключна цяжкіх умовах Кіраў арганізаваў адпор пераважаючым сілам ворага, адстаяў багаты Астраханскі край, вусце вялікай Волгі.

Пасля вайны Кіраў усе свае здольнасці, гарачае сэрца, вялікі розум аддае на аднаўленне разбуранай народнай гаспадаркі. Пад яго кіраўніцтвам аднаўляюцца нафтавыя промыслы Баку. Ён згуртоўвае працоўных Азербайджана на барацьбу з ворагамі.

1925 год. XIV з'езд партыі прымае гістарычную праграму індустрыялізацыі нашай краіны. Прэзрэнныя банды трацкістаў, зіноўеўцаў і бухарынцаў выступаюць супроць індустрыялізацыі, супроць будаўніцтва соцыялізма. Яны хочуць аднавіць у СССР капіталізм, зрабіць радзіму працоўных усяго свету прыдаткам да капіталістычных дзяржаў. Контррэволюцыянеры звіваюць сабе гняздо ў Ленінградскім губкоме. ЦК ВКП(б) накіроўвае ў Ленінград тав. Кірава. І Сергей Міронавіч бязлітасна выкарчоўвае з усіх нор здраднікаў рабочага класа, згуртоўвае вакол Цэнтральнага Камітэта партыі і таварыша Сталіна ленінградскіх большэвікоў і ўсіх працоўных горада Леніна і вядзе іх на вялікае будаўніцтва. І ў хуткім часе ленінградская партыйная арганізацыя займае падабаючае ёй месца ў першых радах змагароў за соцыялістычнае будаўніцтва.

Верны сын партыі Сергей Міронавіч Кіраў быў заўсёды цесна звязан з народам, з рабочымі і сялянамі. Ён бываў на фабрыках, на заводах, у калгасах і вёсках, на месцы ўглыбляўся ва ўсе пытанні, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння. Ён асабіста выбраў месца для будаўніцтва новага горада ў Хібінскай тундры. Працоўныя нашай краіны гэты вялікі горад назвалі іменем Кірава.

Сергей Міронавіч Кіраў усё сваё жыццё аддаў партыі і народу. Барацьбу за чыстату радоў большэвіцкай партыі ён лічыў галоўнай задачай. Штодзённа заняты арганізацыйнай і практычнай работай, Кіраў не забываў аб ідэйна-тэарэтычнай вучобе. Ён гаварыў: «Самае каштоўнае, самае дарагое, самае блізкае для ўсякага большэвіка—гэта ленінскае выхаванне членаў нашай партыі». Сам Кіраў у дасканаласці валодаў марксісцка-ленінскім вучэннем.

Прэзрэнныя пігмеі і вырадкі чалавецтва ўзнялі руку на жыццё Сергея Міронавіча Кірава. Совецкі народ сцёр з твару зямлі азвярэўшых бандытаў, здраднікаў, паспяхова пабудаваў соцыялізм і пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна будуе комунізм. На здрадніцкае забойства Сергея Міронавіча Кірава совецкі народ адказаў яшчэ большым згуртаваннем сваіх радоў вакол свайго любімага правадыра вялікага Сталіна. Кожны новы год прыносіць усё новыя і новыя поспехі совецкай краіне. Совецкі Саюз намнога расшырыўся і павялічыўся. Справа, за якую аддаў сваё жыццё Кіраў, усё больш і больш перамагае.

Вечная памяць табе, народны любімец, палкі трыбун рэволюцыі, Сергей Міронавіч Кіраў!

Твой светлы, крыштальна-чысты вобраз большэвіка натхняе нас на новыя і новыя перамогі, на рашучую барацьбу з ворагамі працоўнага народа. Ты вечна будзеш жыць у сэрцах мільёнаў працоўных усяго свету.

Гутаркі і даклады аб С. М. Кіраве

ГРОДНА. **(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).** Аддзел прапаганды і агітацыі Гродненскага гаркома партыі распрацаваў план правядзення кіраўскіх дзён. Быў праведзен семінар для дакладчыкаў і прапагандыстаў горада.

Зараз на выбарчых участках, прадпрыемствах, ва ўстановах агітатары праводзяць гутаркі і даклады аб гадавіне зладзейскага забойства С. М. Кірава.

Пры парткабінеце гаркома партыі арганізавана выстаўка, якая ілюстроўвае жыццё і рэволюцыйную дзейнасць Сергея Міронавіча Кірава.

* * *

АЎГУСТОЎ. **(Па тэлефону).** Па ўсіх выбарчых участках раёна праведзены інструктыўныя даклады для агітатараў і бяседчыкаў аб жыццёвым шляху і дзейнасці Сергея Міронавіча Кірава. 1 снежня па ўсіх установах і ўчастках будуць праведзены даклады аб С. М. Кіраве.

ДАМБРОВА. **(Па тэлефону).** Сёння агітатары пачынаюць праводзіць заняткі з выбаршчыкамі, прысвечаныя памяці Сергея Міронавіча Кірава. Яны раскажуць насельніцтву аб жыцці і рэволюцыйнай дзейнасці вялікага трыбуна С. М. Кірава.

У раённай бібліятэцы арганізавана вітрына літаратуры аб Кіраве. Ва ўсіх школах будуць праведзены гутаркі і даклады.

Станем працавітымі, дысцыплінаванымі, энергічнымі майстрамі сваёй прафесіі!

Вучні Гродненскага рамесленага вучылішча, прыехаўшыя з Скідэльскага раёна. На здымку (справа налева) Сцяпан Хацяневіч (калгас ім. 1 мая, Дубнаўскага сельсовета), Іван Жалудак (соўгас Скідэль), Пётр Салей (калгас ім. 1 мая), Антон Ключнік (соўгас Скідэль) і Пётр Косцечка (калгас ім. 1 мая).

Фота А. Сапіра.

Буду вучыцца на „выдатна“

Мне 16 год. У свой час я скончыў 4 класы. Працягваць вучобу далей не мог, бо ў майго бацькі нехапала сродкаў на ўтрыманне сям'і. Так я тры годы, як кажуць, празябаў. Вучыўся на шорніка.

Зараз мяне прынялі ў школу ФЗА будаўнікоў. Я паспяхова закончу курс вучобы. З вялікай радасцю буду авалодваць новай кваліфікацыяй плотніка. Спадзяюся, што буду высокакваліфікаваным рабочым.

Напярэдадні пачатку вучобы хочацца падзяліцца сваімі думкамі. Толькі совецкая ўлада дае мне магчымасць набыць прафесію, стаць высокакваліфікаваным рабочым.

Абяцаю, што буду вучыцца на «выдатна», буду прыкладным вучнем ФЗА будаўнікоў.

Л. Гільбоўскі,
вучань Саколкаўскай школы ФЗА.

—o—

Апраўдаю званне вучня рамесленага вучылішча

Калі знаходзіўся ў дзіцячым доме, я чуў, што ёсць на свеце такая краіна, у якой дзеці працоўных бясплатна атрымліваюць спецыяльнасць. За 10 год жыцця ў капіталістычным доме беспрытульных я не бачыў ніводнага радаснага дня. Над намі здзекаваліся, забівалі галавы рэлігійным вучэннем, палохалі нячыстай сілай.

Калі мы пачулі, што ідзе Чырвоная Армія, я з групай таварышоў уцёк з дома беспрытульных. У апошні час у якасці вучня працаваў на механічна-сталярнай фабрыцы горпромкамбіната.

Зараз я вучань рамесленага вучылішча. З вялікай радасцю я прышоў у гэта вучылішча, каб асвайваць спецыяльнасць токара. Я ўпэўнен, што стану карысным чалавекам сваёй радзімы. Апраўдаю званне вучня рамесленага вучылішча.

Леанід Вільчынскі,
вучань Гродненскага рамесленага вучылішча.

—o—

Авалодаю тэхнікай паравозаваджэння

Я з вёскі Вайшкуны, Вілейскай вобласці. Першы раз, калі я прачытаў у газеце аб тым, што ідзе набор у чыгуначныя вучылішчы, я адразу рашыў сваё жыццё прысвяціць рабоце на паравозе. Праўда, бацька мой спярша таварыў мне: «Куды ты паедзеш? Гэта-ж далёка», але я рашыў цвёрда і слова мяняць не збіраўся. Падаў заяву з просьбай прыняць мяне ў чыгуначнае вучылішча. Маю просьбу задаволілі. І вось цяпер з гордасцю магу сказаць, што я вучань чыгуначнага вучылішча. Толькі цяпер, калі ўрад клапоціцца аб дзецях працоўных, юнак можа выбіраць кваліфікацыю, якая яму падабаецца.

Я абавязуюся па сканчэнні чыгуначнага вучылішча быць дысцыплінаваным чыгуначнікам. А яшчэ ў мяне адно жаданне ёсць — гэта стаць стаханаўцам, па-крываносаўску вадзіць саставы.

Антон Януш,
вучань Беластоцкага чыгуначнага вучылішча.

Падрыхтуем высокакваліфікаваныя кадры

Маладыя, бадзёрыя патрыёты запоўняць сёння памяшканне нашага рамесленага вучылішча. Вучылішча створана на базе ФЗВ металістаў. У ім пачнуць вучобу 50 станочнікаў, 50 зборшчыкаў, 125 слесараў, 25 мадэльшчыкаў і 50 сталяроў.

У сваім распараджэнні вучылішча мае 4 цэхі — сталярны, кузнечны, слясарны і механічны. Усе яны забяспечаны неабходным абсталяваннем. Тут ёсць 90 пар цісокў, 50 варштатаў, істужкавыя і цыркулярныя пілы, камбініраваны варштат, 6 такарных станкоў, 2 фрэзерных, 2 стругальных, 2 шэлінгі, пружынны молат, аўтагенна-зварачны апарат і іншае абсталяванне.

Вучылішча ўкамплектавана высокакваліфікаванымі выкладчыкамі і майстрамі. Выкладчыкам спецыяльнай і агульнай тэхналогіі зацверджан тав. Асорадабрай, які на працягу 25 год выкладаў гэтыя дысцыпліны ў спецыяльных навучальных установах. Майстрам кавальскага цэха з'яўляецца тав. Дземідовіч. Ён таксама 25 год працуе інструктарам па кавальскай справе і абучыў нямала кваліфікаваных рабочых. Тав. Бабун працуе на пасадзе старшага майстра вучылішча. Ён карыстаецца заслужаным аўтарытэтам сярод спецыялістаў такарнай справы. Токарам ён працуе 14 год.

Школа мае добры інтэрнат, сталовую, чырвоны куток, вучэбны корпус з шасцю класамі і фізкабінетамі. Ёсць усе магчымасці рыхтаваць высокакваліфікаваныя кадры для нашай соцыялістычнай прамысловасці.

І. Слуцман,
дырэктар Гродненскага рамесленага вучылішча.

Комсамол акажа дапамогу школе ФЗА

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета аб стварэнні працоўных рэзерваў быў горача сустрэт моладдзю нашага раёна. Моладзь, (вызваленая ад капіталістычнага рабства, з радасцю выразіла сваё жаданне ісці ў ствараемыя вучылішчы.

Ва ўсіх вёсках былі праведзены сходы моладзі, на якіх мы растлумачылі вялікую палітычную сутнасць выданага Указа і пастанову СНК СССР аб мабілізацыі гарадской і калгаснай моладзі ў рамесленыя, чыгуначныя вучылішчы і школы ФЗА. Вынік масава-растлумачальнай работы сказаўся: на 30 месц паступіла 70 заяў. У сваіх заявах маладыя патрыёты совецкай радзімы выразілі гарачую гатоўнасць стаць высокакваліфікаванымі рабочымі.

У Саколках створана школа ФЗА будаўнікоў, у якой будзе навучацца 150 чалавек. Яна будзе рыхтаваць кваліфікаваных рабочых-плотнікаў.

Комсамольская арганізацыя прыкладзе ўсе намаганні да таго, каб дапамагчы школе ФЗА ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў.

С. Талерман,
сакратар Саколкаўскага райкома комсамола.

Набуду спецыяльнасць плотніка

Бязрадасным было жыццё моладзі ў часы панавання польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Звычайна, калі юнак заканчваў школу, кваліфікацыю ён не змог набыць. Ды куды наймацца на работу, калі і без таго была вялікая армія беспрацоўных. Вазьму прыклад з сябе. Калі скончыў сямігадовую школу, я вымушан быў сядзець дома. Бацька мой быў саматужнікам і працаваў толькі шэсць месяцаў у год. Бяда з дому не выходзіла. Сям'я складалася з 5 чалавек, аб далейшай вучобе і гаварыць не прыходзілася.

Па-новаму пашло жыццё ў нашай сям'і пасля ўстанаўлення совецкай улады. Атрымаў работу мой бацька, я таксама стаў працаваць.

Калі быў апублікаван Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах, я адразу-ж напісаў заяву ў прызыўную камісію, у якой прасіў залічыць мяне ў школу фабрычна-заводскага абучэння.

Прызыўная камісія задаволіла маю просьбу. Мяне залічылі ў школу ФЗА. Цяжка словамі выразіць маю радасць.

Я комсамолец. Я заяўляю, што буду вучыцца так, каб стаць высокакваліфікаваным рабочым-плотнікам.

А. Штрык,
вучань Саколкаўскай школы ФЗА.

* * *

Буду стаханаўцам

З кожным годам расце наша прамысловасць, чыгуначны транспарт і сельская гаспадарка. Наша соцыялістычная індустрыя абагачаецца навейшай тэхнікай, якая патрабуе высокакваліфікаваную рабочую сілу.

Я з'яўляюся вучнем Беластоцкага чыгуначнага вучылішча. Доўга марыў аб тым, каб працаваць на чыгуначным транспарце. І вось мая мара збылася. Буду авалодваць спецыяльнасцю памочніка машыніста. Абяцаю вучыцца на «выдатна» і пасля сканчэння чыгуначнага вучылішча стаць стаханаўцам.

Б. Тарасаў,
вучань Беластоцкага чыгуначнага вучылішча.

—o—

Настаў жаданы дзень

З вялікай нецярплівасцю кожны з нас, вучняў чыгуначнага вучылішча, чакаў пачатку вучобы. Для мяне гэты дзень — радасная падзея ў жыцці. Я многа марыў аб тым, каб стаць машыністам, аўладаць тэхнікай ваджэння паравоза.

Мой бацька чыгуначнік. На чыгунцы ён працуе з 1909 года. І я таксама рашыў набыць прафесію бацькі.

Маё імкненне такое: хачу быць высокакваліфікаваным машыністам, хачу ўмець вадзіць паязды так, як вадзіў Пётр Крыванос.

Абяцаю, што буду нястомна авалодваць прафесіяй машыніста, буду вучыцца на «выдатна», каб апраўдаць званне вучня чыгуначнага вучылішча.

Міша Цуканаў,
вучань Беластоцкага чыгуначнага вучылішча.

—o—

Навучуся вадзіць паязды па-крываносаўску

Стаць добрым машыністам, дасканала авалодаць гэтай складанай прафесіяй я марыў даўно. І вось 14 лістапада мяне прынялі ў чыгуначнае вучылішча. Жаданне маё ажыццявілася.

Я скончыў сямігодку, вучыўся толькі на «добра» і «выдатна». Будучы вучнем чыгуначнага вучылішча, таксама буду вучыцца толькі на «выдатна», каб стаць выдатным машыністам, па-крываносаўску вадзіць паязды.

Вадзім Дзімітрыеў,
вучань Беластоцкага чыгуначнага вучылішча.

—o—

Наша мара збылася

Пры ўладзе польскіх памешчыкаў і капіталістаў, мы, сыны працоўных сялян, не мелі магчымасці набыць кваліфікацыю. Праклятае мінулае знікла назаўсёды. Наша родная совецкая ўлада стварыла ўсе ўмовы для таго, каб кожны працоўны вучыўся і атрымліваў кваліфікацыю па яго жаданню.

Наша мара збылася. Камісія па прызыву залічыла нас на вучобу ў рамесленае вучылішча.

Ад усяго сэрца дзякуем большэвіцкай партыі і совецкай уладзе за клопаты аб нас. У вучылішчы мы будзем вучыцца на «добра». Атрымаўшы кваліфікацыю, будзем працаваць на вытворчасці па-стаханаўску.

В. Бакун,
С. Клімчук,
вучні рамесленага вучылішча.

УСЯ КРАІНА ШАНУЕ ПАМЯЦЬ СЕРГЕЯ МІРОНАВІЧА КІРАВА

ЛЕНІНГРАД, 30 лістапада. (ТАСС). Працоўныя свята шануюць памяць палкага трыбуна рэволюцыі С. М. Кірава. Многія рабочыя дзеляцца ўспамінамі аб сваіх сустрэчах з любімцам партыі і народа.

Старыя кадравыя рабочыя Іжорскага завода расказваюць аб тым, як у 1930 годзе завод атрымаў пачотнае заданне пабудаваць першы ў Совецкім Саюзе блюмінг. На завод неаднаразова прыязджаў Сергей Міронавіч Кіраў. Ён цікавіўся ўсім ходам работы, аглядаў станін у фасонна-ліцейным цэху, механічнай апрацоўкай дэталяў, гутарыў з рабочымі. У красавіку 1931 года, калі першы блюмінг быў гатоў, Сергей Міронавіч прывітаў іжорцаў з вялікай перамогай. Пры бліжэйшым удзеле Сергея Міронавіча на заводзе была збудавана магутная мартэнаўская восьмая печ. Сталявары назвалі яе іменем Кірава.

Ордэнаносны завод з чэсцю выконвае заветы Кірава. Праграма 1940 года выканана датэрмінова.

* * *

Калектыў Маскоўскага завода «Дынамо», які носіць імя незабыўнага Кірава, адзначае памяць палкага трыбуна рэволюцыі. Ва ўсіх цэхах вышлі спецыяльныя нумары насценных газет, прысвечаныя Сергею Міронавічу.

ПЕТРАЗАВОДСК, 30 лістапада. (ТАСС). У публічнай бібліятэцы адкрылася вялікая выстаўка, прысвечаная С. М. Кіраву. На выстаўцы прадстаўлены творы Кірава, біяграфічныя матэрыялы і вялікая колькасць фотаздымкаў, якія запечатлелі прабыванне С. М. Кірава ў Карэліі.

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Выбаршчыкі Шудзялаўскай выбарчай акругі № 77, Саколкаўскага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Любоў Осіпаўну ПРЫТЫЦКУЮ!

★ ★ ★

Любоў Осіпаўна Прытыцкая

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*).

Сястра Сяргея Прытыцкага, Любоў Осіпаўна, яшчэ маладая: ёй усяго 22 годы, але яна прайшла цяжкі шлях барацьбы з белапольскімі акупантамі, а совецкая ўлада ўзняла яе да ўзроўню дзяржаўнага дзеяча.

Любоў Прытыцкая нарадзілася ў сям'і селяніна-беларуса ў вёсцы Ніжні Шкафт, Пензенскай губерні, куды бацькі прыехалі ў 1915 годзе, уцякаючы ад фронта. У 1921 годзе сям'я вяртаецца на радзіму— у вёску Гаркавічы, Саколкаўскага павета.

У 1930 годзе Люба скончыла 4 класы пачатковай школы. Было жаданне вучыцца далей, але не было сродкаў: бацька меў толькі 3 гектары зямлі, а сям'я складалася з 7 чалавек. І замест вучобы Люба вымушана была зарабляць: ад цямна да цямна яна пасвіла жывёлу сваіх аднавяскоўцаў. Чатыры леты Люба была пастушкай. У гэты час яе старэйшыя браты Аляксандр і Сяргей уступілі на шлях рэвалюцыйнай барацьбы з прыгнятальнікамі. Шчыльна занавесіўшы вокны, яны часта чыталі нелегальную літаратуру, ціха гутарылі між сабой. Люба часта падслухоўвала іх гутаркі і многае па-новаму стала разумець у жыцці.

У 1933 годзе, калі брата Сяргея першы раз арыштавалі, бязлітасна збілі і 6 месяцаў пратрымалі ў турме, у сэрцы 15-гадовай дзяўчынкі загарэлася іскра нянавісці да паліцэйскіх, да паноў-акупантаў. Яна пачынае разумець, за што змагаюцца яе браты, і калі праз год старэйшы брат Аляксандр, хаваючыся ад арышту, пакідае родную вёску і ўходзіць у глыбокае падполле, — Люба займае месца брата: яна ўступае ў нелегальную арганізацыю камсамола і становіцца сакратаром камсамольскай ячэйкі ў вёсцы Гаркавічы.

Як верная дачка працоўнага беларускага народа, Люба ідзе па шляху сваіх братоў. Яна дапамагае ім у падпольнай рэвалюцыйнай рабоце. Ні шматлікія вобыскі, ні арышты і суд над братамі не маглі адпужнуць яе ад рэвалюцыйнай барацьбы.

У 1935 годзе, у час рэлігійнага свята —хрышчэння паліцэйскія наладжваюць гулянку ў вёсцы Гаркавічы. П'яныя, яны разгульваюць па вуліцы, збіваючы гумавымі палкамі ўсіх, хто трапіцца пад руку. Вось два з іх заходзяць у хату Прытыцкіх.

— Дзе сыноў падзелі?—грозна наступаюць яны на бацьку, і калі той апраўдваецца, бязлітасна б'юць гумай па галаве. Паліцэйскія да крыві збіваюць маці, і яна падае, страціўшы прытомнасць. Пяцігадовая сястрычка Іра, перапалоханая, кідаецца з плачам да паліцэйскага, і той гумавай палкай збівае яе з ног. Невядома, чым-бы скончыўся гэты крывавы разгул азвярэлых бандытаў, калі-б не рашучыя дзеянні Любы. Праз акно яна выскачыла на вуліцу і пачала клікаць

суседзяў на дапамогу. На крык збеглася моладзь, акружыла дом і каменнем закідала паліцэйскіх. Комсамольцы прагналі паліцэйскіх з вёскі.

1936 год. У Віленскім акруговым судзе Сяргей Прытыцкі страляе ў правакатара. Сяргея прыгаварваюць да пакарання смерцю, пазней замяніўшы прыгавор на пажыццёвую катаргу. Маці не пераносіць удару. Перад смерцю яна звяртаецца да дзяцей:

— Мне, відаць, не дачакацца таго дня, калі мае сыны вернуцца дамоў. Перадайце ім, каб яны давodзілі справу да канца.

Пасля смерці маці Люба застаецца гаспадыняй, на яе плечы кладуцца клопаты аб сям'і. Маладая рэвалюцыянерка не спыняе пачатай справы. Яна аднаўляе разгромленую арганізацыю, наладжвае сувязь з суседнімі вёскамі. Яе выбіраюць сакратаром райкома комсамола. У 1937 годзе Люба Прытыцкая праводзіць кампанію салідарнасці з гераічнай Іспаніяй. Пад яе кіраўніцтвам моладзь вышывае хустачкі рэспубліканскім байцам, збірае грошы. За 40 кілометраў Люба хадзіла ў Гродненскую турму, носячы перадачы палітзняволеным.

У верасні 1939 года Люба Прытыцкая радасна сустракае Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію, якая велічна несла насустрач ёй чырвоны сцяг, амыты крывёю сваіх братоў і таварышоў. Вітаючы танкістаў, Люба ўспомніла прадсмяротныя словы маці.

«Мама, мама! Як шкада, што не дажыла ты да сённешняга радаснага дня. Ты-б выйшла разам з намі сустракаць сваіх родных сыноў, прыйшоўшых нам на дапамогу. А іх так многа! Яны ідуць і ідуць. Ярка гараць іх чырвонаармейскія зоркі...»

Так думала Люба, і на вачах выступалі слёзы.

А праз некаторы час сям'я сустракала Сяргея. Ён заехаў дамоў па дарозе з Масквы, дзе выступаў з прамовай на Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

З устанаўленнем совецкай улады Люба Прытыцкая едзе на курсы совецкага актыва. Тут яе прымаюць у члены ЛКСМБ.

Вясной 1940 года Люба Прытыцкая пабывала ў адным з калгасаў Мінскага раёна. Раскрытымі вачыма яна глядзела на новае жыццё, радавалася поспехам калгаснікаў і тады-ж рашыла, што такое жыццё трэба зрабіць і на сваей радзіме.

З 1 сакавіка 1940 года Люба Прытыцкая працуе старшынёй Бабікоўскага сельсовета, Саколкаўскага раёна. Яна праявіла сябе добрым арганізатарам, умелым кіраўніком. Па ініцыятыве старшыні сельсовета сяляне выйшлі на будаўніцтва новых дарог, на загатоўку і вывазку лесу. У сельсовеце наладжана палітычна-масавая работа.

Любоў Осіпаўна Прытыцкая карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод сялян. Выражэннем іх давер'я з'явілася вылучэнне Любы Прытыцкай кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных. Калі на агульным сходзе калгаснікаў сельгасарцелі імені Варашылава было пастаўлена пытанне аб вылучэнні кандыдата, калгаснікі заявілі:

— Каго-ж, калі не Любу Прытыцкую—нашага старшыню сельсовета.

Прапанову варашылаўцаў горача падтрымалі калгаснікі сельгасарцелі імені Сталіна, сходы сялян па вёсках. Акруговая выбарчая камісія зарэгістрыравала Любоў Осіпаўну Прытыцкую кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных па Шудзялаўскай выбарчай акрузе № 77.

— Вылучэнне кандыдатам,—гаворыць тав. Прытыцкая,—вялікая для мяне чэсць. Толькі пры совецкай уладзе магчыма, каб звычайная сялянская дзяўчына стала дзяржаўным дзеячом, каб перад ёй былі адкрыты ўсе дарогі. Давер'е выбаршчыкаў я пастараюся апраўдаць— буду вернай слугой народа.

Пацвярджэннем гэтых слоў з'яўляецца прыгожы жыццёвы шлях Любы Прытыцкай. Яна з'яўляецца дастойным кандыдатам сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Ал. Нёманскі.

Выбаршчыкі Мястkoўскай выбарчай акругі № 72, Ломжынскага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Тэадору Аляксандраўну СІКОРА!

★ ★ ★

Тэадора Аляксандраўна Сікора

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*).

На Тэадору Аляксандраўну Сікора ў самыя маладыя годы лёг вялікі цяжар — утрымліваць сям'ю. Дзяўчына-падростак асталася без бацькі. У юнацкія годы пазнала яна ўсю горыч суровага жыцця. Нарадзілася Тэадора ў 1899 годзе ў Мясткове, Ломжынскага павета, Беластоцкага ваяводства. Дачка селяніна-бедняка, яна з самых ранніх год, будучы яшчэ дзевяцігадовай дзяўчынкай, пачала жыць самастойна. Ад зары да зары яна працавала ў полі.

У маладой дзяўчыны паявілася вялікая цяга да ведаў. Яна паступае ў пачатковую сельскую школу ў другі клас і старанна бярэцца за вучобу. Праз два годы Тэадора паспяхова заканчвае тры класы гміннага вучылішча. Але не збылося поўнасцю жаданне яе працягваць далей вучобу.

У хуткім часе пасля смерці бацькі паміpae маці. Не стала самых блізкіх і родных. Асталося чацвёра сірот без сродкаў да існавання.

Тэадора павінна выхоўваць сірот. Яна паступае няняй да служачага чыгуначнай станцыі Астраленка. Зарабляе мізэрныя сродкі, каб як-небудзь пракарміць сябе і маленькіх сірот. Многа прыйшлося перанесці і перажыць безабароннай дзяўчыне.

Так працуе яна да першай імперыялістычнай вайны 1914 года, якая прыносіць новае гора. Вёска, у якой жыла Тэадора, была зусім разбурана і спалена. Згарэла і хата Тэадоры. Чацвёра сірот асталіся без прытулку.

Тэадора з сястрой Феліксай працуе на астаўшыхся ад бацькі трех моргах зямлі. У 1927 годзе Тэадора працуе ў памешчыка Грахоўскага ў якасці кухаркі.

З прыходам Чырвонай Арміі ў 1939 годзе яна выпраміла сваю спіну і ўздыхнула свабодна. Тав. Сікора цяпер прымае актыўны ўдзел у стварэнні новага жыцця.

— Мне ўспамінаецца,—гаворыць Тэадора,—як ашуканствам і подкупам выбіралі раней войта. Працоўны раней не мог быць выбраны ў мясцовыя органы ўлады. Выбіраўся толькі той, хто меў буйную гаспадарку, той, хто мог падкупіць выбаршчыкаў. Вельмі мне запомніўся адзін эпізод з выбараў войта. У вёсцы Рыбакі было два багатых селяніна, якія вельмі жадалі быць выбранымі ў войты: адзін па прозвішчу Асташэўскі, другі—Шаблоўскі. Асташэўскі зарэзаў быка і склікаў да сябе выбаршчыкаў; другі прывёз да сябе цэлую бочку піва. Вынік атрымаўся наступны: усе былі п'яныя і не ведалі, за каго галасаваць. Войтам быў выбран трэці чалавек.

Толькі пры совецкай уладзе народу дадзена поўнае права выбіраць і быць выбранымі. Сяляне трох сельсоветаў Мястkoўскай выбарчай акругі вылучылі Тэадору Аляксандраўну Сікора кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных як адданую дачку працоўнага народа.

Тав. Сікора працуе намеснікам старшыні Мястkoўскага сельсовета. Яна, актывістка-грамадчыца дапамагае сялянам і калгаснікам вырашаць задачы новага будаўніцтва.

П. Грышчанка.

Кандыдаты чыгуначнікаў

Чэслаў Квяткоўскі

Рабочыя паравознага цэха Лапскага паравоза-вагонарамонтнага завода аднадушна вылучылі сваім кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета тав. Чэслава Квяткоўскага, беспартыйнага, майстра механічнага цэха. 18 год назад тав. Квяткоўскі паступіў на завод вучнем. Яшчэ юнаком ён стаў прымаць актыўны ўдзел у рэвалюцыйнай рабоце. Дэфензіва ўзяла яго пад асобы нагляд. Сумесна з перадавымі рабочымі, ва ўмовах паліцэйскага рэжыму, тав. Квяткоўскі ўдзельнічаў у правядзенні рэвалюцыйных свят—1 Мая, гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, пісаў рэвалюцыйныя лозунгі. А ноччу раскідваў лістоўкі, развешваў лозунгі і сцягі на тэлеграфных слупах, на сценах дамоў.

Калі ў г. Лапы была ўстаноўлена совецкая ўлада, тав. Квяткоўскі быў назначан старшынёй Часовага Упраўлення горада. У мінулым годзе працоўныя выбралі яго дэпутатам Народнага Сабрання Заходняй Беларусі. Як і ўсе працоўныя вызваленай зямлі, ён галасаваў за ўстанаўленне совецкай улады.

Пасля тав. Квяткоўскі прымае актыўны ўдзел у грамадскай рабоце завода. Пад яго кіраўніцтвам цэх заваяваў першынства ў соцспаборніцтве і стаў перадавым на паравоза-вагонарамонтным заводзе.

Люцыян Партынскі

Цяжкім і бязрадасным было дзяцінства Люцыяна Партынскага. Падросткам ён паступіў на цукровы завод, каб дапамагчы сям'і. У 1928 годзе Люцыян — чорнарабочы. У хуткім часе юнак уступае ў падпольную комсамольскую ячэйку. Як найбольш развітага, аўтарытэтнага, Люцыяна выбіраюць сакратаром ячэйкі. Ён з галавой уходзіць у рэвалюцыйную работу.

У маі 1932 года Партынскага сумесна з яго таварышамі па падпольнай партыйнай рабоце—Фарэмняком, Кавальскім і іншымі арыштоўваюць і аддаюць пад суд. Прыгавор суда быў кароткім: «Асудзіць на пажыццёвае зняволенне».

Восем цяжкіх год Люцыян прабыў у зняволенні. Больш 2-х год сядзеў у адзіноцтве. Толькі змрочныя турэмныя сцены былі нямымі сведкамі страшэнных здзекаў, якія прышлося перацярпець Люцыяну. Чырвоная Армія, якая прынесла на сваіх сцягах шчасце працоўным заходніх абласцей Беларусі, вызваліла з капіталістычнага турэмнага палону рабочых, палітычных зняволеных, а сумесна з імі вышаў на свабоду і Партынскі.

Памятны дзень—2 лістапада 1940 года. Ідзе сход работнікаў паравознага дэпо Беласток, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Советаў. І першым было названа прозвішча памочніка машыніста тав. Партынскага. Яго кандыдатуру паравознікі вылучылі для балатыроўкі ў дэпутаты абласнога Совета па Першамайскай акрузе № 8 г. Беластока.

Еўгеній Налівайка

Саставіцель паяздоў станцыі Беласток-Цэнтральная Еўгеній Налівайка—самы малады кандыдат сярод чыгуначнікаў. Яму ўсяго 19 год. Калектыў станцыі вылучыў яго кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета. Сапраўднае жыццё Еўгенія пачалося ў верасні 1939 года.

Яшчэ нядаўна Налівайка з групай вясковых хлапцоў выходзіў да чыгункі і вясёлым поглядам праводзіў паязды.

— Як добра працаваць на чыгунцы!—таварыў Еўгеній, звяртаючыся да таварышоў. Але ва ўмовах капіталістычнай Польшчы гэта была толькі мара. Бацька Еўгенія сабраў апошнія грошы і аддаў яго вучыцца ў прыватную кузнечна-слясарную майстэрню. Абучэнне падыходзіла да канца. Усё часцей Еўгеній задумваўся над будучым жыццём, аб тым, дзе яму пашчасліўіцца знайсці работу, бо на вуліцах Польшчы многа беспрацоўных.

Верасень быў вялікім святам для Налівайкі. Атрымаўшы права на працу, ён рашыў ажыццявіць заветную мару—стаць чыгуначнікам. І вось 25 снежня Еўгеній паступіў на курсы стрэлачнікаў станцыі Беласток-Цэнтральная. Тут ён уступае ў рады ленінска-сталінскага комсамола. Для юнака адкрыўся светлы, прасторны шлях. Скончыўшы паспяхова вучобу на курсах, Налівайка неўзабаве становіцца стрэлачнікам, а ў маі 1940 года яго вылучылі на адказную работу—саставіцелем паяздоў. Высокаякасна і хутка фарміраваць саставы, выконваць у змену паўтары нормы, сустрэць дзень выбараў новымі вытворчымі поспехамі — вось пад якім лозунгам працуе цяпер Еўгеній Налівайка.

Работнікі станцыі аказалі яму высокую чэсць і давер'е, як аднаму з лепшых стахановцаў саставіцельнага цэха і актыўнаму ўдзельніку ў грамадскай рабоце. Ён аддае ўсе сілы на далейшае ўмацаванне гаспадарчай і абароннай магутнасці соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

15 снежня чыгуначнікі станцыі Беласток усе як адзін прыдуць да выбарчых урнаў і аддадуць свае галасы за дастойных кандыдатаў непераможнага сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

А. Кандрацьеў.

Сустрэча кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных тав. Мілашэвіч з выбаршчыкамі

У мястэчку Лунны, Скідэльскага раёна, адбылася сустрэча кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных Анны Сяргееўны Мілашэвіч з сваімі выбаршчыкамі. Клуб мястэчка не ўмяшчаў усіх жадаючых прысутнічаць на гэтай сустрэчы. Тав. Мілашэвіч слухалі сяляне, калгаснікі, саматужнікі, інтэлігенцыя. Яна расказвае пра жыццё і работу свайго калгаса імені Варашылава, Русінаўскага сельсовета.

Аб гэтым калгасе ёсць што расказаць. Першы год калектыўнай работы прынёс нядрэнныя вынікі. Атрыман высокі ўраджай яравых культур — па 11-13 цэнтнераў, жыта — па 18 цэнтнераў. Калгас заводзіць малочна-таварную ферму. На кожны працадзень калгаснікі атрымліваюць сёлета па 8—9 кілограмаў хлеба і 25 кілограмаў бульбы. Чэсныя калгаснікі атрымаюць столькі дабра, колькі яны ніколі не мелі і не маглі мець раней.

Поспехі калгаса заваёваны чэснай, упорнай працай лепшых калгаснікаў. І лепшай з лепшых у калгаснай рабоце была ранейшая батрачка Анна Мілашэвіч. Сваім перадавым прыкладам яна вяла за сабой жанчын-калгасніц, арганізоўвала іх на лепшую работу.

Калгаснікі вылучылі тав. Мілашэвіч кандыдатам у абласны Совет дэпутатаў працоўных.

На сённяшняй сустрэчы з сваімі выбаршчыкамі Анна Сяргееўна з хваляваннем гаворыць аб гаротным, забітым жыцці працоўных сялян у былой Польшчы, аб цяжкай долі батрачкі:

— Мы зараз радуемся сваім шчасцем, якое нам прынесла дарагая Чырвоная Армія, якое дала нам родная совецкая ўлада. За наша свабоднае жыццё, за вызваленне ад панскага прыгнёту я дзякую вялікай большэвіцкай партыі, нашаму мудраму бацьку таварышу Сталіну.

Словы тав. Мілашэвіч пакрываюцца громам апладысментаў прысутных.

Затым выступілі выбаршчыкі, якія заклікалі галасаваць у дзень выбараў за лепшую прадстаўніцу вызваленага сялянства ў органах совецкай улады, чэсную перадавую калгасніцу тав. Мілашэвіч. Таварышы Глот, Іваноў, Шаблоўскі і іншыя гаварылі, як у былой Польшчы працоўнае сялянства не магло выстаўляць сваіх кандыдатаў у органы дзяржаўнай улады. Туды трапялі эксплаататары працоўных, ворагі працоўнага народа. Толькі Сталінская Канстытуцыя забяспечвае вялікія правы працоўным, толькі пры совецкай уладзе можа выбіраць і быць выбранай у органы совецкай улады працоўная сялянка.

На сустрэчы прысутнічала каля 500 чалавек. З мастацкай самадзейнасцю выступілі вучні Скідэльскай сярэдняй школы.

М. Масарноўскі,
прапагандыст Скідэльскага райкома партыі.

Сустрэча кандыдатаў з сваімі выбаршчыкамі

У добра абсталяваным памяшканні выбарчага ўчастка № 40 сабраліся выбаршчыкі двух выбарчых акруг (144 і 146) па выбарах у Беластоцкі гарадскі Совет дэпутатаў працоўных на сустрэчу з сваімі кандыдатамі ў дэпутаты.

Роўна ў 5 гадзін і 30 мінут вечара старшыня ўчастковай камісіі адкрыў сход. За сталом прэзідыума — кандыдаты ў дэпутаты гарадского Совета Валенціна Юльянаўна Ізмайловіч і Рыкля Ізраілеўна Дварковіч.

З яркай прамовай выступіла кандыдат у дэпутаты горсовета па 144 выбарчай акрузе тав. Дварковіч. Яна на яўрэйскай мове расказала аб сваім цяжкім жыццёвым шляху ў панскай Польшчы. Толькі з прыходам Чырвонай Арміі і ўстанаўленнем совецкай улады яна атрымала работу. Цяпер працуе прадаўшчыцай гастранома № 18, з'яўляецца адной з лепшых работніц актывістак, старшыня мясцовага камітэта.

З прамовы кандыдата ў дэпутаты гарадского Совета тав. ДВАРКОВІЧ

— Хіба я магла марыць пры панскай Польшчы, што мне прыдзецца выступаць на такіх вялікіх сходах перад народам, што мне, звычайнай работніцы, будзе аказана такая чэсць! Толькі совецкая ўлада, большэвіцкая партыя і вялікі Сталін зрабілі жанчыну роўнаправўнай грамадзянкай, толькі пры совецкай уладзе працоўны народ удзельнічае ў кіраўніцтве дзяржавай. Я запэўніваю вас, дарагія таварышы выбаршчыкі, што апраўдаю аказанае мне давер'е, буду чэсна і самааддана служыць свайму народу.

Тав. Фрэйдановіч, выступіўшая ад імя выбаршчыкаў 144 выбарчай акругі, запэўніла, што выбаршчыкі, усе як адзін, аддадуць свае галасы за актыўную работніцу, стаханаўку т. Дварковіч.

Наступнае слова атрымала давераная па 146 выбарчай акрузе тав. Чэрамісава. Пасля выступіла кандыдат у дэпутаты гарадскота Совета Валенціна Юльянаўна Ізмайловіч.

З прамовы даверанай па 146 выбарчай акрузе тав. ЧЭРАМІСАВАЙ

— Таварышы! Наша Канстытуцыя з'яўляецца самай дэмакратычнай канстытуцыяй у свеце. Вызваленыя народы Заходняй Беларусі карыстаюцца ўсімі правамі канстытуцыі. Знікла нацыянальнае прыгнечанне, якое распальваў ненавісны народу былы польскі ўрад. Працоўныя атрымалі права выбіраць і быць выбранымі ў органы сваёй улады.

Кандыдат у дэпутаты гарадского Совета т. Ізмайловіч, якая балатыруецца па нашай выбарчай акрузе № 146, з'яўляецца прадстаўніком маладога пакалення. Калектыў педвучылішча вылучыў яе кандыдатам у дэпутаты як добрую, актыўную і адданую комсамолку, выключна чулага таварыша. Я магу запэўніць выбаршчыкаў, што тав. Ізмайловіч апраўдае на справе званне дэпутата гарадского Совета.

З прамовы кандыдата ў дэпутаты гарадского Совета Валенціны Юльянаўны ІЗМАЙЛОВІЧ

— Я нарадзілася ў 1916 годзе ў г. Віцебску ў сям'і чыгуначніка. У 1936 годзе скончыла механічны тэхнікум і працавала ў лабараторыі. У 1935 годзе ўступіла ў комсамол, кандыдат ВКП(б) з 1940 г. Комсамольская арганізацыя г. Віцебска накіравала мяне ў 1939 г. на курсы прапагандыстаў пры ЦК ЛКСМБ. Пасля скапчэння іх Цэнтральным Камітэтам комсамола Беларусі я была накіравана ў Віцебскі гарком комсамола, дзе працавала ў якасці інструктара аддзела прапаганды і агітацыі, а потым загадчыкам гэтага-ж аддзела. Пасля рэарганізацыі апаратаў райкомаў і гаркомаў комсамола мяне накіравалі ў г. Беласток комсоргам ЦК ВЛКСМ у педагагічнае вучылішча і рабфак.

Я дзякую калектыву педвучылішча, які вылучыў мяне кандыдатам у дэпутаты Совета. Дзякую і вас, таварышы выбаршчыкі, за аказаную мне чэсць і давер'е. Я абяцаю, што аддам усе сілы і здольнасці на тое, каб на справе апраўдаць ваша давер'е.

Сёння спаўняецца 6 год з дня зладзейскага забойства Сергея Міронавіча Кірава

★ ★ ★

Сергей Міронавіч Кіраў

Шэсць год назад, 1 снежня 1934 года, куляй трацкісцка-бухарынскаг. бандыта быў забіт Сергей Міронавіч Кіраў, член Палітбюро ЦК ВКП(б), сакратар Цэнтральнага і Ленінградскага камітэтаў партыі. Перастала біцца палкае сэрца мужнага барацьбіта, які трыццаць год змагаўся ў радах партыі Леніна—Сталіна за справу рабочага класа за шчасце працоўнага чалавецтва.

У БОЛЬШЭВІЦКІМ ПАДПОЛЛІ

Суровае і выпатнае жыццё пражыў С. М. Кіраў. У раннім дзяцінстве страціўшы бацькоў, ён блізка пазнаў нястачу і лішэнні. Дзіцячыя годы Кіраў правёў у «доме прытулку малагодніх сірот» у горадзе Уржуме, Вяцкай губерні (цяпер Кіраўскай вобласці).

Невясёлыя гэта былі годы. Мізэрныя сродкі, якія адпускаліся на ўтрыманне дома прытулку, часткова траплялі ў кішэні зладзеяў-эканомаў, якія абкрадвалі дзяцей, дрэнна іх апраналі і кармілі.

Але жыццерадаснасць — якасць, адрозніваўшая ўсё жыццё С. М. Кірава,—не пакідала яго і ў прыюце. Ён быў важаком дзетвары, арганізатарам забаўных гульняў і, надзелены вялікімі здольнасцямі, выдатна вучыўся.

Школу С. М. Кіраў скончыў з выдатным атэстатам і паступіў у механіка-тэхнічнае вучылішча ў горадзе Казані. Нястача і голад неадступна праследвалі юнака, але і ў Казані ён праявіў сябе здольным, таленавітым вучнем. І тут ён удзельнічае ў падпольнай рэвалюцыйнай рабоце.

Па сканчэнні Казанскага вучылішча Кіраў у 1904 годзе пераязджае ў Томск, дзе паступае на вячэрнія агульнаадукацыйныя курсы, адначасова працуючы чарцёжнікам гарадской управы.

У Томску Сергей Міронавіч устанаўлівае сувязь з рабочымі-бальшэвікамі, удзельнічае ў тайных рэвалюцыйных гуртках і ў канцы 1904 года становіцца бальшэвіком.

Дзевятнаццацігадовы Кіраў сваёй нястомнасцю, сваёй адданасцю рэвалюцыйнай справе, удумлівасцю і рашучасцю заваяваў сабе сярод рабочых павагу і папулярнасць.

Кірава некалькі раз саджалі ў турмы, прытаварвалі да зняволення ў крэпасці, утрымлівалі ў жудасных умовах. Але ў царскім засценку ён астаецца верным сабе: седзячы ў агульнай камеры, ён знаёміць сваіх таварышоў па зняволенню з артыкуламі В. І. Леніна; пераведзены ў адзіночку, ён вывучае нямецкую мову, каб мець магчымасць чытаць у арыгінале «Капітал» Маркса.

Кіраў на свабодзе. Але жандары не пакідаюць яго ў пакоі. Ён пакідае Сібір і ўязджае на Паўночны Каўказ, у Уладзікаўказ (цяпер горад Орджанікідзе).

КІРАЎ У БАКУ

У момант прыезду С. М. Кірава нафтавая гаспадарка Баку была развалена. Такім яе аставілі гаспадарыўшыя тут інтэрвенты, якія ўзарвалі перад прыходам Чырвонай Арміі склады, знішчылі машыны.

Праз год пасля прыезду Сергея Міронавіча ў Баку фабрыкі, заводы, транспарт СССР сталі атрымліваць бакінскую нафту, і паток яе павялічваўся з кожным месяцам, з кожным днём.

Стаў непазнаваемым і Баку. Замест пракопчаных душных мазанак, у якіх пры капіталістах жылі рабочыя, выраслі выдатныя рабочыя пасёлкі, акружаныя зеленню.

У Кірава бакінскія рабочыя вучыліся сталінскаму стылю работы, у яго яны вучыліся бальшэвіцкаму ўпорству, перамагаючаму ўсе цяжкасці, якімі-б вялікімі яны ні былі.

БУЙНЕЙШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ДЗЕЯЧ

У снежні 1925 года С. М. Кіраў быў пасланы ў Маскву дэлегатам на XIV з'езд бальшэвіцкай партыі. Гэты з'езд выдатны тым, што ён прыняў сталінскі план сацыялістычнай індустрыялізацыі СССР, грандыёзны план, які, як вядома, прывёў Савецкі Саюз да бліскучых перамог сацыялізма.

Супроць гэтага плана, супроць Цэнтральнага Камітэта партыі і таварыша Сталіна выступілі здраднікі Зіноўеў і Каменеў, якія дзейнічалі па ўказцы мацёрага здрадніка Троцкага.

Трацкісты, зіноўеўцы і іншыя здраднікі справе рабочага класа выступілі супроць плана індустрыялізацыі Савецкага Саюза. Ворагі разумелі, што індустрыялізацыя прывядзе да перамогі сацыялізма ў нашай краіне, між тым, як яны імкнуліся да рэстаўрацыі (аднаўлення) капіталізма ў СССР.

Спроба трацкісцка-зіноўеўска-бухарынскай апазіцыі правaліць план сталінскай індустрыялізацыі пацярпела поўнае крушэнне. Партыя пайшла па шляху, прадначартанаму Цэнтральным Камітэтам, таварышам Сталіным.

Адным з самых энергічных і палкіх барацьбітоў за сацыялістычную індустрыялізацыю СССР быў С. М. Кіраў.

Бліскучы прамоўца, які ўмеў запальваць сэрцы людзей, Кіраў на многалікіх сходах у Ленінградзе выкрываў зіноўеўцаў, якія прабавалі звярнуць Савецкую краіну ў бок ад ленінскага шляху. Кіраў быў нястомным у прапагандзе ленінскіх запаветаў, увасабляемых у жыццё пад геніяльным кіраўніцтвам таварыша Сталіна.

У лютым 1926 года С. М. Кіраў быў выбран першым сакратаром Ленінградскага губернскага камітэта ВКП(б).

Гэта выбранне супала з тым перыядам, калі Ленінград павінен быў адыграць адказную і пачотную ролю — стаць пастаўшчыком машын і абсталявання для велізарнай колькасці новых заводаў і фабрык, якія будаваліся ў СССР. У гэты час асабліва разгарнуліся арганізатарскія здольнасці С. М. Кірава, буйнейшага партыйнага і дзяржаўнага дзеяча, дасканала ведаючага патрэбы народнай гаспадаркі.

Новым фабрыкам, заводам, электрастанцыям патрэбны былі такія машыны, якія ў дарэвалюцыйнай Расіі не выпускаліся. Кіраў дабіваецца, каб савецкія інжынеры і рабочыя вывучалі перадавую замежную тэхніку і на яе аснове наладжвалі вытворчасць складанейшых машын. Па яго ініцыятыве ленінградскія заводы сталі выпускаць першыя савецкія трактары, першыя магутныя турбіны для электрастанцый, першыя блюмінгі для металургічных заводаў, першы савецкі алюміній.

Здаўна існаваў памылковы погляд, быццам у Ленінградскай вобласці няма выкапных багаццяў. Кіраў абвергнуў гэтую думку. Геалагічнымі разведкамі, прадпрынятымі па яго ўказанню, у вобласці былі выяўлены гаручыя сланцы, медзь, руда, свінец, ртуць, сыравіна для алюмінія. Велізарныя запасы апатыту і нефеліну былі знойдзены ў Хібінскай тундры, дзе, па настойлівасці Сергея Міронавіча, быў пабудован камбінат па распрацоўцы гэтай каштоўнейшай хімічнай сыравіны.

Расцвіла і сельская гаспадарка на Поўначы. Кіраў даказваў, што «няма такой зямлі, якая-б ва ўмелых руках пры Савецкай уладзе не магла быць павернута на дабро чалавецтва». Калгаснікі Ленінградскай вобласці, натхнёныя заклікам Сергея Міронавіча, сталі ўпершыню ў гэтых паўночных месцах сеяць пшаніцу, а ў Хібінскай тундры пачалі вырошчваць агуркі, памідоры, кавуны.

Кіраў карыстаўся велізарнай папулярнасцю. Да яго прыходзілі як да блізкага чалавека, у якога можна атрымаць дапамогу, параду, указанне. Да яго звярталіся і старыя, і моладзь, і дзеці. Яго любілі не толькі ленінградскія бальшэвікі: яго любіла ўся партыя, уся Савецкая краіна.

Ворагі народа баяліся Кірава і ненавідзелі яго таму, што ён быў бязлітасны да здраднікаў і беззаветна адданы партыі, вялікаму Сталіну.

Страціўшыя ўсялякае чалавечае аблічча, трацкісцка-бухарынскія ізвергі здрадніцкім выстралам забілі Кірава, любімца партыі і народа.

Савецкі народ адказаў на здрадніцкае забойства аднаго з самых любімых і таленавітых кіраўнікоў павышэннем рэвалюцыйнай пільнасці, бязлітасным разгромам трацкісцка-бухарынскіх бандытаў, агентаў міжнароднага імперыялізма.

Ні на мінуту не забываючы аб тым, што СССР знаходзіцца ў капіталістычным акружэнні, савецкі народ і ў далейшым будзе бязлітасна граміць ворагаў сацыялістычнай радзімы: шпіёнаў, забойцаў, дыверсантаў, — для якіх няма месца на савецкай зямлі.

* * *

Жыццё Сергея Міронавіча Кірава вучыць, як трэба змагацца за справу рэвалюцыі, вучыць беззаветнай адданасці партыі Леніна — Сталіна, вучыць непрымірымай нянавісці да ворагаў народа. Светлы вобраз С. М. Кірава, аддаўшага ўсё сваё жыццё за шчасце народа, будзе натхняць на новыя і новыя перамогі 193-мільённы савецкі народ, які ідзе пад кіраўніцтвам партыі Леніна —Сталіна ўперад, да камуністычнага грамадства.

І. Верхоўцаў.

Канст. ФЕДЗІН

АБ КІРАВЕ

З любоўю і здзіўленнем думаеш заўсёды аб Кіраве.

Серожа Кострыкаў у дзяцінстве любіў чытаць аб падарожжах і прыгодах — кнігі дзіўныя, упойваючыя сваёй марай, дзівоснасцю выдумак і незвычайнасцей. Далёка - далёка адлятала ўяўленне хлопчыка ад грузнай паўсядзённасці мяшчанскага Уржума.

Напэўна з дзіцячых год, пачынаючы з укромных, захапляючых душу чытанняў ля газавай лямпы, да нястрымаиых страсцей лятуценніка Серожы Кострыкава дадалася страсць даследчыка. Яна не пакідала Кірава ніколі і, нарэшце, расцвіла ў імклівай рэўнівай любві к Поўначы.

І ўжо неаддзяліма ад вобраза Кірава фантастычная, як у кнізе дзяцінства, карціна: бушуе пурга, стогне запалярны вецер, няма рысы паміж зямлёй і небам, беспрасветная ноч; у розвальнях, захутаны ў шубу, занесены снегам, павольна, упорна рухаецца ўперад падарожнік; выбіваюцца з сіл коні, расцягваецца абоз, губляюць людзі з віду адзін другога, коўны аршын шляху бярэцца з намаганнем і цяжкасцямі; але няўхільна чалавечая воля, уперад, уперад, да далёкай мэты.

Падарожніка з хваляваннем чакаюць у маленькім бараку геолагі-разведчыкі, інжынеры, рабочыя. І вось паказаліся з пургі коні, чалавек у розвальнях выпрастаўся, з яго паваліўся камамі снег, ён моцна адмахнуў на бок цяжкі каўнер, і людзі ўбачылі ўсмешку Кірава.

Здаецца, так нядаўна адбылася гэта небывалая нарада ў снягах, каля пячуркі, перад якой паціраў рукі Кіраў, у нізкім, цёмным, прадымленым бараку, а не верыцца, што ты жыў у тую пару, таму што на гэтым месцы, дзе саграваўся ля пячуркі Кіраў, у снягах, вырас, як у кнізе дзяцінства, вялікі горад, у дымах, у стуку і шуме работы, у агнях электрычнасці, вялікай, гудзячай сірэнамі аўтабусаў, з прыручанай, падпарадкаваўшайся чалавеку чароўнай гарой Кукісвумчор, якая зрыта шахтамі, і таксама гарыць агнямі, і толькі бурчыць у адказ на нясныпныя ўзрыўныя залпы аманала.

Як дзіўна! Зусім-жа нядаўна, пасля нарады, якая працягвалася цэлую ноч, Кіраў, разагнуўшы спіну, вышаў з барака. Буран пакрыху сціх. З цяснін нёсся з пасвістам вецер, круцячы дробныя сняжынкі. Доўга глядзеў Кіраў на горы, моўчкі і нерушыма. Яму паказалі смутную, ледзь прыкметную вяршыню Кукісвумчора. І ён па-сяброўску звярнуўся да таварышоў:

— Многа вам прыдзецца папрацаваць, каб абламаць гэтыя месцы..

Многа папрацавана з тых пор, і не дрэнна абламаны горы Хібінскай тундры і абламаны многія іншыя цяжкія месцы...

Кіраў быў прыроджаным піонерам. Ён шукаў смела, усюды быў на месцы, усюды ўперадзе. Сапраўднасць не магла застаць яго знянацку. Не гаворачы аб палітыцы, у якой ён быў, як птушка,— у вышыні, ён усюды адчуваў сябе закліканым. Ён вывучаў матэматыку і супраціўленне матэрыялаў. Калі спатрэбілася, стаў вывучаць мінералогію і геалогію. Ён ведаў рыбную гаспадарку і турбінабудаўніцтва. І ўсё гэта не дзеля платанічнай самаадукацыі. Не, ён займаўся геалогіяй —і аднавіў Баку, сядзеў над супраціўленнем матэрыялаў — і заклаў новую індустрыю Ленінграда.

Аднойчы ён выклікаў да сябе маладога бальшэвіка і сказаў, што хоча паслаць яго на вугаль. Той вугалю не ведаў і яму не хацелася ісці.

— А ты паспрабуй,—сказаў Кіраў,—вось я не ведаў нафты, паспрабаваў—вышла. Вайну не ведаў, паспрабаваў—вышла...

Яго смеласць была разнастайнай. Калі смелы вынаходца Лебедзеў эксперыментыраваў ва ўбогай лабараторыі ваенна-медыцынскай акадэміі, яму нехапала грошай, і амаль ніхто не верыў у яго эксперымент, Кіраў зразумеў, што трэба рызыкнуць: ён даў Лебедзеву грошай. І ён не памыліўся: у адказ Лебедзеў даў Савецкаму Саюзу сінтэтычны каучук.

Але Кіраў валодаў і другой смеласцю, той, якая цягне за сабой байцоў, вучыць бясстрашшу і адвазе.

Адзін рабочы расказвае:

— Сабіралі машыну, машына не ладзілася. Раптам—Кіраў. Растлумачылі яму, што справа дрэнна, выпрабоўваць не будзем. А машына абароннага значэння. Нічога, гаворыць Кіраў, давайце паспрабуем, і стаў сам на рабочую частку. Вялікі рыск. Яго просяць у бок, а ён не ўходзіць. Камандуе: давайце поўнацэнную загатоўку. Дзве загатоўкі прайшлі. На трэцяй — страшэнны трэск. Кінуліся да тормазаў. Мы-б уцяклі, а ён выстаяў да канца. Калі ўсё скончылася, мы па вуглах, не падыходзім да яго. Саромімся. Ён пытае—чаго па вуглах схаваліся? Зышліся. Ён і гаворыць: ну што-ж, на гэты раз яна мяне спалохалася а ўвогуле—змяніце пад'ёмнік, пастаўце на мёртвую, тады ўсё будзе ў парадку...

Усё яго аблічча авеяна народнасцю. Рабочыя, з якімі не то, што дакранаўся, а быў сплецен яго лёс, на меткай сваёй мове запечатлелі гэты вялікі кіраўскі дар народнасці.

— Раз я ў яго сяджу,—гаворыць другі рабочы,—скручваю закурку, а ён гаворыць: «Ты не ўмееш скручваць, таму ў цябе і пальцы заўсёды абгарэлыя. Трэба не такую, як ты скручваеш, а казіную ножку. Сагнутую». Узяў паперку, адарваў кавалак, скруціў напалову, працягнуў мне: «На, паслюнь». Потым узяў, скруціў да канца, сагнуў: «На, куры»...

Ён жыў страсна і, як усякі страсны чалавек, ведаў цану радасці, весялосці.

— Кіраў заўсёды амаль быў вясёлы. Нават калі пазмрачнее, то хутка зноў вясёлы...

— Я насіў старую інжынерскую фуражку. Многія на гэта коса глядзелі. А Сергей Міроныч убачыў мяне ў форменай фуражцы, стаў мне чэсць аддаваць. Я і зняў яе...

— Купіў я сабе пальто новае, кепку. Ён выходзіць з Смольнага. Нават спыніўся—ого,—гаворыць,— з вас прыходзіцца!..

За незвычайную любоў гэтага чалавека к жыццю жыццё плаціла яму незвычайнай любоўю. І ўспамінаеш, і думаеш аб ім, і сэрца б'ецца, як білася, калі ў кнізе дзяцінства сустракаўся цудоўны герой, за якім хацелася ісці ўперад і ўперад, без агляднкі.

★ ★ ★

Народны трыбун

Бліскучы арганізатар, народны трыбун, слова якога будзіла сазнанне мас, клікала і арганізоўвала на барацьбу, Сергей Міронавіч Кіраў быў адным з буйнейшых будаўнікоў нашай партыі і ўлады Саветаў. Кіраў быў арганізатарам партыйнага падполля да рэвалюцыі, адным з першых палітычных камісараў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі ў тыя дні, калі маладая Савецкая рэспубліка знаходзілася ў вогненным кальцы інтэрвентаў і белагвардзейскіх полчышчаў. Ён быў адным з выдатных кіраўнікоў партыі і ўрада ў тыя годы, калі краіна аднаўляла свае сілы пасля грамадзянскай вайны і будавала сацыялістычную прамысловасць, сацыялістычную сельскую гаспадарку.

Рэвалюцыйная дзейнасць С. М. Кірава пачынаецца ў 1904 годзе, напярэдадні першай рускай рэвалюцыі. Сергею Кострыкаву (Кіраву) не было яшчэ і 19 год, калі ён у Томску прымае ўжо актыўны ўдзел як бальшэвік у рабоце мясцовай сацыял-дэмакратычнай арганізацыі. Не гледзячы на процідзеянне меншавікоў, Кіраў стварыў у Томску рабочую баявую дружыну. Гэтая дружына на чале з Кіравым адыграла немалую ролю ва ўзброенай дэманстрацыі 18 студзеня 1905 года ў Томску, арганізаванай у адказ на «Крывавую нядзелю». Будучы пасланым для арганізацыі стачкі на станцыю Тайга, Кіраў і тут стварыў баявую дружыну з мясцовых рабочых.

Баявы рэвалюцыйны вопыт, атрыманы ім у маладосці, Кіраў пранёс праз усё сваё яркае жыццё, развіваючы і ўдасканальваючы яго. На Паўночным Каўказе ў 1918 годзе, у Астрахані ў 1919 годзе, зноў на Паўночным Каўказе і ў Закаўказзі ў 1920 годзе Кіраў узначальвае буйнейшыя баявыя часці Чырвонай Арміі, вядзе іх да перамогі. Разам з таварышам Сталіным, разам з тт. Варашылавым, Фрунзе, Орджанікідзе, Куйбышэвым С. М. Кіраў будаваў і выхоўваў Чырвоную Армію.

Партыя пасылала С. М. Кірава на адказнейшыя ўчасткі. Калі трэба было, Кіраў, буйнейшы ваенны работнік у годы грамадзянскай вайны, стаў дыпламатам. У 1920 годзе Сергей Міронавіч быў паўнамоцным прадстаўніком Савецкай Расіі ў Грузіі, якая знаходзілася тады пад уладай меншавікоў, ездзіў у Рыгу ў саставе савецкай дэлегацыі для заключэння міру з белапанскай Польшчай. Затым ён — на чале партыйнай арганізацыі Азербайджана. З 1926 года ён становіцца кіраўніком бальшэвікоў Ленінграда. Яго выбіраюць сакратаром ЦК партыі, членам Палітбюро.

Пад кіраўніцтвам Кірава ўвасабляецца ў жыццё сталінскі план рэканструкцыі бакінскіх нафтапромыслаў. Ленінград ён ператварае ў магутную крэпасць сацыялістычнай індустрыі нашай краіны. Будаўніцтва новых гідраэлектрастанцый на паўночных рэках, выкарыстанне мясцовага паліва (торфу, гаручых сланцоў), асваенне Поўначы—усё гэта адбываецца пад кіраўніцтвам С. М. Кірава.

Свой вялікі вопыт, свой выдатны арганізатарскі талент Кіраў укладваў у кожную даручаную яму справу. Кіраў быў звязан тысячамі ніцей з рабочымі, інжынерамі, калгаснікамі, аграномамі, ездзіў на заводы, у калгасы. Яго можна было сустрэць і ў лабараторыі вучонага, і ў студэнцкай аудыторыі, і ў школе. Ён глыбока вывучае важнейшыя галіны прамысловасці, важнейшыя навуковыя праблемы, маючыя народна-гаспадарчае значэнне. Сіла кіраўскага кіраўніцтва заключалася ў тым, што ён па-ленінску, па-сталінску ўмеў падыходзіць к жывым людзям, будаўнікам сацыялізма.

Хібінская тундра была снежнай пустыняй, калі туды прыехаў С. М. Кіраў з вучонымі і гаспадарнікамі. Кіраў асабіста выбраў месца для новага горада, і тут, ля падножжа гор, дзе былі знойдзены велізарныя запасы апатыту, нефеліну — каштоўнейшай хімічнай сыравіны,— быў пабудаван вялікі камбінат па распрацоўцы гэтых багаццяў. Кіраў асабіста кіраваў пабудовай фабрык, электрастанцый, новага горада, які носіць цяпер яго слаўнае імя.

Па ўказаннях Кірава ў Ленінградскай вобласці і на Поўначы хутка развіваецца сацыялістычнае земляробства. Там, дзе зямля ўвесь час давала адно толькі нізкарослае жыта, пачынае каласіцца пшаніца, паўночныя раёны атрымліваюць сваю гародніну.

На працягу ўсяго свайго трыццацігадовага партыйнага жыцця Кіраў змагаўся з ворагамі рабочага класа. Юнаком у вучнёўскіх гуртках Казані, маладым партыйцам у Томску, у годы першай рускай рэвалюцыі ён вёў барацьбу супроць меншавіцкага засілля, супроць эсэраў. У дні барацьбы за перамогу Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі Кіраў у Уладзікаўказе громіць меншавікоў. У годы грамадзянскай вайны ён выступае супроць здрадніцкіх загадаў Троцкага, спрабаваўшага аддаць дзенікінцам Астрахань. У 1920 — 1921 гг. Кіраў вядзе барацьбу супроць трацкістаў, бухарынцаў, супроць «рабочай» апазіцыі. Кіраў разам са сваім сябрам і саратнікам Серго Орджанікідзе граміць на Паўночным Каўказе і ў Закаўказзі мясцовых нацыянал-ухілістаў.

Кіраў правёў велізарную ачышчальную работу ў Ленінградскай арганізацыі. З усіх нораў выкурвалася прытаіўшаяся трацкісцка-зіноўеўская нечысць. Да кіраўніцтва партыйнымі і савецкімі арганізацыямі, прамысловасцю прыходзяць сотні і тысячы палітычна крэпкіх пролетарыяў, выхоўваемых Кіравым у бальшэвіцкім духу, адданых партыі Леніна—Сталіна. Пад кіраўніцтвам Кірава ленінградская парторганізацыя ператварылася ў непрыступную для ворагаў партыі бальшэвіцкую крэпасць.

Сергей Міронавіч быў прасякнут найвялікшай любоўю, бязмежнай адданасцю да вялікага правадыра, настаўніка і друга працоўных — таварыша Сталіна. Гэта любоў і бязмежная адданасць бальшэвіцкай партыі, таварышу Сталіну Кіраў перадаў усім ленінградскім бальшэвікам, усім працоўным Ленінграда. З глыбокім хваляваннем, з велізарнай сілай таварыш Кіраў аб таварышу Сталіне:

«Цяжка прадставіць сабе постаць гіганта, якім з'яўляецца Сталін. За апошнія годы, з таго часу, калі мы працуем без Леніна, мы не ведаем ніводнага павароту ў нашай рабоце, ніводнага якога-небудзь буйнага пачынання, лозунга, накіравання ў нашай палітыцы, аўтарам якога быў-бы не таварыш Сталін, а хто-небудзь другі. Уся асноўная работа — гэта павінна ведаць партыя — праходзіць па ўказаннях, па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна».

1 снежня 1934 года подлыя ворагі сацыялізма абарвалі цудоўнае жыццё любімца народа С. М. Кірава. Але трацкісцка-зіноўеўска-бухарынскія вырадкі жорстка праічыліся, думаючы прыпыніць пераможнае шэсце комунізма ўперад. Яны былі знішчаны. Кіруемы Сталіным савецкі народ працягвае вялікую справу, за якую аддаў сваё цудоўнае жыццё С. М. Кіраў.

Памяць аб Сергею Міронавічу Кіраве, аддаўшым сваё жыццё за перамогу комунізма ў нашай краіне, ва ўсім свеце, не згасне ніколі. Светлы прыклад яго бясстрашнай, нястомнай барацьбы за пролетарскую рэвалюцыю, за будаўніцтва сацыялізма ў СССР будзе натхняць мільёны пролетарыяў і ўсіх працоўных на далейшую барацьбу за таржаство сацыялізма, за канчатковае выкараненне ўсіх ворагаў рабочага класа.

І. Разгон.

ПАМЯЦІ С. М. КІРАВА

КАЗАНЬ, 28 лістапада. (ТАСС). У Казанскім хіміка-тэхналагічным інстытуце імені Кірава адкрылася выстаўка, прысвечаная дзесяцігоддзю інстытута. Значнае месца на выстаўцы займае куток Кірава; у механіка-тэхнічным вучылішчы (на базе якога створан інстытут) вучыўся Сергей Міронавіч Кіраў. У дакументах і фатаграфіях наглядна адлюстравана жыццё Кірава ў Казані. Тут прадстаўлена многа рэдкіх дакументаў (дзіцячыя рысункі Кірава, вучнёўскія чарцяжы, фатаграфіі Сергея Міронавіча і яго родных).

У апошнюю гадзіну

СТАНОВІШЧА У РУМЫНІІ

НЬЮ-ЙОРК, 30 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс перадае, што згодна дыпламатычных паведамленняў, атрыманых з Бухарэста, у Румыніі за апошнія тры дні забіта 2.000 чалавек, у тым ліку многа яўрэяў.

—о—

СТАНОВІШЧА У ФРАНЦУЗСКІМ ІНДА-КІТАІ

ШАНХАЙ, 30 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе з Ханоя карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, 28 лістапада на граніцы Інда-Кітая і Таі была чутна ружэйная страляніна. Адначасова ў афіцыяльных кругах адмаўляюць паведамленне, што японцы прад'явілі новыя патрабаванні ў адносінах Паўднёвага Інда-Кітая і што там знаходзяцца японскія войскі.

НЬЮ-ЙОРК, 30 лістапада. (ТАСС). Карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе з Бангкока, што выпшйшае камандаванне Таі абвяргае паведамленні з Вішы аб тым, што авіяцыя Таі пачала першай налёты на граніцу. Указваюць, што авіяцыя Таі вымушана была прыняць адказныя меры.

Як паведамляе ханойскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, афіцыяльна абвяргаецца, што ўлады французскага Інда-Кітая прадаставілі Японіі авіяцыйныя базы ў Сайгоне. Французскія ўлады спадзяюцца ліквідаваць ваенныя дзеянні на граніцы Інда-Кітая і Таі. На аснове аўтарытэтных звестак паведамляецца, што 7 самалётаў Таі 26 лістапада бамбардыравалі некаторыя стратэгічныя пункты ў цэнтральнай частцы французскага Інда-Кітая.

Вайна паміж Грэцыяй і Італіяй

БЕЛГРАД, 30 лістапада. (ТАСС). Газета «Врэме» паведамляе: «Бой паміж італьянцамі і грэкамі ўступілі 27 лістапада ў рашаючую фазу. Абодва бакі вядуць барацьбу з максімальным напружаннем, бо ўчастак фронта паблізу горада Пагрэдзец з'яўляецца вельмі важным у стратэгічных адносінах. Акрамя таго, ваюючыя бакі, відавочна, улічваюць набліжэнне зімы. Авіяцыя і артылерыя абодвух бакоў дзейнічае бесперапынна ўдзень і ўночы. 28 лістапада бой пачаўся вельмі рана. Ужо ў 3 гадзіны раніцы ў горадзе Охрыдзе была чутна жорсткая гарматная кананада. Першымі адкрылі агонь італьянцы. Дуэль працягвалася да 16 гадзін дня. На дарозе Дураццо—Эльбасан—Пагрэдзец італьянцы бесперапынна дастаўляюць к фронту падмацаванні і матэрыязваныя часці».

У другім паведамленні «Врэме» піша: «Абодва ваюючыя бакі пачалі ў шырокіх размерах ваенныя дзеянні. Асабліва актыўнасць праяўляе італьянская авіяцыя. 8 італьянскіх бамбардыроўшчыкаў бамбардыравалі горад Фларыну і знаходзячыйся там аэрадром. У рэзультаце налёту ўспыхнула многа пажараў. На горад былі скінуты бомбы буйнага калібру».

Газета «Палітыка» паведамляе, што 27 лістапада авіяцыя абодвух бакоў была вельмі актыўнай. Італьянцы прадпрымалі паветраныя налёты ў шырокіх размерах.

ХРОНІКА

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР 30 лістапада 1940 года ратыфіцыраваў дагавор аб гандлі і мараплаванні паміж СССР і Венгрыяй, заключаны ў г. Маскве 3 верасня 1940 г. (ТАСС).

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 30 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае зводку вярхоўнага камандавання германскай арміі:

У ноч на 29 лістапада і ўдзень 29 лістапада Лондан зноў быў аб'ектам атакі германскай авіяцыі. Адзначаны вялікія пажары на доках Вікторыя, а таксама ў паўднёва-заходняй частцы Лондана. Буйныя злучэнні германскай бамбардыровачнай авіяцыі атакавалі ўночы ваенныя аб'екты Ліверпуля, а таксама докі Беркенхеда, кінуўшы бомбы буйнейшага калібру. Бамбардыроўка выклікала вялікай сілы ўзрывы і пажары на складах, раскінутых на вялікай тэрыторыі. Акрамя таго, бамбардыроўцы нападалі іншыя ваенныя аб'екты Паўднёвай і Цэнтральнай Англіі. Вялікая колькасць бомб скінута на Бірмінгам, Брыстоль, Портсмут і Саутгемптон.

У другой палове дня 29 лістапада батарэі германскай дальнабойнай артылерыі прапягвалі планамерны абстрэл ваенных збудаванняў, размешчаных у сектары Дуўра. Германская артылерыя абстраляла англійскія параходы і ваенныя судны ля ўсходняга выхада Ла-Манша.

У рэзультаце налёту англійскай авіяцыі ў ноч на 30 лістапада на Паўночную і Заходнюю Германію пашкоджана некалькі дамоў і невялікае прамысловае прадпрыемства. На працягу ўчарашняга дня збіта 4 непрыяцельскіх самалёты. Два германскіх самалёты прапалі без вестак.

Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што мінулай ноччу германская авіяцыя зрабіла буйны налёт на Лондан. У гэтым налёце ўдзельнічала некалькі сот самалётаў, якія скінулі каля 400 тысяч кілограмаў фугасных і 36 тысяч кілограмаў запальваючых бомб. Далейшыя атакі германскай авіяцыі, але ўжо ў меншых маштабах, былі накіраваны супроць Бірмінгама, Ліверпуля і Плімута. Адначасова італьянскія самалёты атакавалі Іпсвіч, скінуўшы бомбы на чыгуначныя збудаванні і доку. Пачынаючы з вечара 28 лістапада страты авіяцыі абодвух бакоў выражаюцца ў суадносінах 2:1 у карысць германскай авіяцыі.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 30 лістапада. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, учора ўночы германскія самалёты скінулі вялікую колькасць фугасных і запальваючых бомб над адным раёнам Лондана, выклікаўшы многа-лікія пажары, якія былі хутка ліквідаваны. На словах агенцтва, гэты налёт быў найбольш інтэнсіўным за апошнія дні. У ім удзельнічала вялікая колькасць германскіх самалётаў.

Самалёты праціўніка зрабілі таксама налёты на адзін з гарадоў Паўднёва-Заходняга ўзбярэжжа Англіі, на Уэльс, цэнтральную і ўсходнюю часткі Англіі. У адным горадзе цэнтральнай часткі Англіі ў рэзультаце бамбардыроўкі налічваецца многа ахвяр.

Афіцыяльна паведамляецца, што германскія самалёты бамбілі Ліверпуль і горад у паўночна-заходняй Англіі.

Амерыканскія паведамленні

НЬЮ-ЙОРК, 30 лістапада. (ТАСС). На паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, учора ўночы германскія самалёты зрабілі налёт на з раёнаў Лондана і скінулі сотні запальваючых і некалькі буйнакаліберных фугасных бомб.

250 германскіх самалётаў падверглі жорсткай бамбардыроўцы Ліверпуль.

Агенцтва Асошыэйтэд Прэс паведамляе, што ўчора ўночы і сёння раніцай германскія самалёты падвергалі Лондан найбольш інтэнсіўнай за апошнія 10 дзён бамбардыроўцы. Ад бамбардыроўкі пацярпелі таксама Ліверпуль, адзін горад Уэльса і два гарады ў Паўднёва-Заходняй Англіі.

НЬЮ-ЙОРК, 30 лістапада. (ТАСС). На паведамленню агенцтва Асошыэйтэд Прэс, з 14 верасня з-за бамбардыровак, адбываўшыхся амаль кожную ноч, насельніцтва Гаўра ўкрываецца ў бліжэйшых гарах. Бамбардыроўкамі пашкоджаны біржа, пошта, магазіны і іншыя аб'екты, не маючыя ваеннага значэння, неаднаразовай бамбардыроўцы, падлягаў таксама гаўрскі порт.

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

АФІНЫ, 30 лістапада. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне грэчаскай арміі паведамляе, што на разнастайных участках фронта адбываліся бая, якія закончыліся заняццем грэкамі новых пазіцый на албанскай тэрыторыі і ў асаблівасці ў раёне на поўнач ад Коніспаліса.

У камюніке камандавання англійскіх ваенна-паветраных сіл у Грэцыі паведамляецца, што на працягу апошніх двух дзён англійскія знішчальнікі збілі 10 непрыяцельскіх самалётаў. 28 лістапада у паветраным бай у паўднёва-заходняй частцы Албаніі англійскія знішчальнікі збілі 7 італьянскіх самалётаў. Англійскія бамбардыроўшчыкі зрабілі налёт на Санты-Кваранта, Дурацо і Эльбасан. У Санты-Кваранта бомбы былі скінуты на судны. Два англійскіх самалёты не вярнуліся на сваю базу.

У паведамленні грэчаскага міністэрства дзяржаўнай бяспекі паведамляецца, што ў рэзультаце налётаў італьянскай авіяцыі за першы месяц вайны, з 28 кастрычніка па 28 лістапада 1940 года, налічваецца 604 забітых, з якіх — 274 жанчыны і 152 дзіцяці. Ранена 1.070 чалавек, з якіх —425 жанчын і 205 дзяцей. У гарадах і вёсках разбурана 200 дамоў.

НЬЮ-ЙОРК, 30 лістапада. (ТАСС). На паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, грэчаскія войскі ўчора ў 9 гадзін раніцы пачалі наступленне з пазіцыі ў гарах Грамос.

Дзесяць італьянскіх самалётаў бамбардыравалі Паргу і Прэвезу. Бамбардыроўцы падвергліся таксама Патры, дзе было забіта 7 чалавек і ранена 9. Грэчаскія знішчальнікі збілі 2 італьянскіх самалёты. Адзін грэчаскі самалёт не вярнуўся на сваю базу.

11 італьянскіх транспартных суднаў прыбылі ў Дурацо. З гэтых суднаў высадзіліся падмацаванні, якія адпраўлены на фронт.

У Аргіракастроне адбываюцца сур'ёзныя бойкі. Грэчаскія патрулі захапілі італьянскія перадавыя пасты.

На радзіме Адама Міцкевіча

(Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта)

Машыны хутка імчацца па гладкай шасе, паабапал якой праплываюць прыгожыя пейзажы Навагрудскай зямлі. Шматлікія госці — руская, беларуская, польская, яўрэйская пісьменнікі, крытыкі, навуковыя работнікі — едуць у Навагрудак, каб ушанаваць памяць вялікага паэта. Хтосьці гучна кінуў:

— Світазь!

Нібы электрычная іскра прабегла па людзях. Світазь! Колькі чароўных паэтычных радкоў прысвяціў Адам Міцкевіч гэтаму возеру! І нібы па заклiку паэта, выказаным у баладзе «Світазь», дзе паэт заклікае кожнага, хто будзе ў Навагрудскай зямлі, спыніць сваіх коней і агледзець гэта возера, — спыняюцца машыны. Мы ідзем між векавых дубоў, што густой сцяной абступілі возера. Мы глядзім—і як у казцы перад намі рассціліаецца водная гладзь,

«Пушчай густой па баках
ачарнёна,
А гладка, як шыба лёду».

Гусцеюць змрокі. І перад намі паўстаюць малюнкі з Міцкевічаўскіх балад:

«Зоры над намі і зоры пад намі».

Мы адчуваем паэтычнае дыханне Міцкевіча, яго голас даходзіць да нас, свежы і непадзржальны. Не хочацца пакідаць гэты ўлюбёны куток Міцкевіча.

* * *

Стары Навагрудак нібы памаладзеў у юбілейныя дні. Ён упрыгожыўся ў чырвань сцягоў, прыняў урачысты від. Новыя песні гучаць пад дахамі яго дамоў, і сярод іх пачэсна месца займаюць натхнёныя песні Адама Міцкевіча. Дастойны сын Навагрудскай зямлі праз цемру нялага века прышоў у совецкі горад за ўсёй сваёй велічы і сустрэў тут сапраўднае разуменне і пашану.

Землякі паэта глыбока шануюць памяць свайго паэта. Яны беражліва захоўваюць усё, што звязана з яго імем.

З глыбокім душэўным хваляваннем узыходзім мы на высокі «Курган Міцкевіча», што велічным помнікам узвышаецца над Навагрудкам і яго ваколіцамі. З кургана адкрываецца цудоўны краявід: палі, зрэзаныя глыбокімі ярамі і далінамі, безліч узгоркаў, а далей — лясы з векавымі дубамі, беластвольнымі бярозамі, смалістымі соснамі і ёлкамі. Побач з курганом — руіны старажытнага замка XV века, так цудоўна апетыя Адамам Міцкевічам.

Але звернемся да кургана. Гэта — не звычайны ўзгорак, а своеасаблівы помнік, збудаваны самім народам у памяць аб вялікім паэце. Каралі і магнаты, памешчыкі і капіталісты ненавідзелі вялікага паэта, яны баяліся яго нават пасля смерці. 8 разоў узбуджалі землякі паэта хадайніцтва перад уладамі аб збудаванні помніка Адаму Міцкевічу на яго радзіме. Але царскі ўрад не даў дазволу. У музеі знаходзяцца 12 праектаў помніка, якія не маглі быць ажыццёўлены ні ва ўмовах царскай Расіі, ні ў панскай Польшчы. Хадайніцтва ўзнімала дачка паэта Марыля Гарайская, але і на гэты раз дазвол не быў атрыман. І тады сам народ рашыў увекавечыць памяць аб сваім песняры. Народ рашыў збудаваць своеасаблівы помнік — насыпаць вялікі курган. Усе, каму быў дораг Адам Міцкевіч, у кайстрах, ранцах і кішэнях везлі і несці сваю зямлю на гэты курган, які з кожным годам рос і ўзвышаўся над горадам. Так быў пастаўлен сапраўды народны помнік, наперакор афіцыяльным уладам.

Не менш характэрна гісторыя стварэння музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку. Домік, дзе нарадзіўся і правёў дзяцінства паэт, яшчэ ў 1820 годзе Гродненскае губернскае ўпраўленне прадало з таргоў, каб пакрыць шматлікія даўгі, што засталіся пасля смерці маці паэта. Домік купіў навагрудскі адвакат Біёолт, які быў жанаты на нейкай Дамброўскай. Па спадчыне домік перайшоў Дамброўскім і быў іх уласнасцю да верасня мінулага года. Крэсла, на якім сядзеў Адам Міцкевіч, забраў у свой кабінет навагрудскі бургамістр, прырабіўшы да яго мяккае сядзенне.

Толькі пры совецкай уладзе домік Адама Міцкевіча рэканструяваны у музей. Праароблена вялікая работа па збору і афармленню дакументаў і іншых экспанатаў. Музей становіцца здабыткам працоўных.

* * *

На невысокім узгорку, акружаны каштанамі, ліпамі і дубамі, стаіць аднапавярховы белы домік. Залатымі літарамі на мемарыяльнай дошцы напісана: **«Тут на рассвеце жыцця распраўляў крыллі к палёту Адам Міцкевіч».** З душэўным трэпетам мы пераступаем парог. У першым пакоі на высокім пастаменце—бюст паэта. У шасці пакоях размешчаны шматлікія экспанаты, якія расказваюць аб жыцці і дзейнасці вялікага паэта. Вось ляжыць метрычны запіс аб нараджэнні: «Нарадзіўся ў Навагрудку 24 снежня 1798 года, атрымаў пры хрышчэнні імёны Адам і Бернард». Побач — атэстат зрэласці, а далей экспанаты расказваюць аб вучобе Міцкевіча ў Віленскім універсітэце. Тут фатаграфіі паэта ў студэнцкія годы, падручнікі, якімі ён карыстаўся, творы «Пані Анелія», «Мешко», «Князь Навагрудскі» і інш. Дакументы расказваюць аб удзеле Міцкевіча ў тайных студэнцкіх арганізацыях, а далей аб працы настаўнікам у Коўне.

У ноч на 24 кастрычніка 1823 года паэт быў арыштаван па справе тайных таварыстваў «філарэтаў і філаматаў». Вось фатаграфія Базельскага манастыра, пераўтворанага ў турму, дзе сядзеў паэт. Тут-жа дакументы аб высылцы Міцкевіча.

Адным з самых цікавых раздзелаў музея з'яўляецца раздзел «Міцкевіч і Пушкін», дзе паказана благароднейшая дружба двух геніяў рускай і польскай літаратуры. Гэта дружба чырвонай стужкай праходзіць праз творчасць абодвух паэтаў, яна жывіла і акрыляла іх.

На сцяне вісіць плакат з выдатнымі радкамі Пушкіна аб Міцкевічу.

У вітрынах музея выстаўлены рэдкія экземпляры кніг паэта, поўны збор твораў, пераклады на нямецкую, французскую, украінскую, беларускую, рускую, яўрэйскую, англійскую, італьянскую, персідскую і іншыя мовы, а таксама творы, пакладзеныя на музыку.

Значнае месца ў музеі адведзена Міцкевічу-публіцысту, у прыватнасці шырока паказана яго дзейнасць у «Трыбуне народаў».

У сувязі з 85-годдзем з дня смерці Адама Міцкевіча Баранавіцкі абласны выканаўчы камітэт вынес пастанову аб увекавечанні памяці паэта. Імя Міцкевіча прысвоена двум польскім школам у Баранавічах і Навагрудку, а таксама рабочаму клубу шклозавода «Нёман». Пастаноўлена пабудаваць у Навагрудку помнік паэту.

Падрастаючае пакаленне Навагрудчыны гардзіцца тым, што нарадзіўся і вырас тут, дзе нарадзіўся вялікі Адам Міцкевіч.

Т. Лясовіч.

г. Навагрудак.

Шорная арцель «Вольная праца» (гор. Аўгустоў) выканала план 3-га квартала на 120 процантаў.

На здымку: загадчык арцелі тав. Марковіч (справа) гутарыць з лепшымі стаханаўцамі Л. Ш. Білевічам (злева) і С. Я. Сургулеўскім.

Фота А. Сапіра.

Сталінскія клопаты аб дзецях

Месяц таму назад незвычайнае натхненне ахапіла вучняў 25-й яўрэйскай няпоўнай сярэдняй школы. Яны даведаліся, што іх школу ў хуткім часе перавядуць у новае будынак, намікнемае, абудаванае ўжо за час совецкай улады.

Сустрэць момант пераходу ў новы будынак з высокай паспяваемасцю—вось задача, якую паставілі перад сабой вучні школы.

Асобныя класы заключылі паміж сабой дагавор на соцспаборніцтва. Згодна гэтага дагавора, клас, які зойме ў гэтым спаборніцтве першае месца, першы ўвойдзе ў новы будынак.

Наступіў радасны дзень. Апошні раз дзеці сабраліся ў старым памяшканні школы. З сцягамі, з радаснымі песнямі накіраваліся яны ў новы будынак. Уперадзе ішлі вучні чацвертага класа, якія ў соцыялістычным спаборніцтве занялі першае месца (класны кіраўнік тав. Шэйнбаум).

Перад будынкам (Сасновая, 60) вучняў чакалі прадстаўнік горана і дырэктар школы. Яны віншавалі школьнікаў з новай школай. Ад імя вучняў адказала выдатніца 6-га класа Сіма Левін.

— Мы абяцаем,—сказала яна,— у новай школе вучыцца так, каб таварыш Сталін сказаў «выдатна».

Першы ўвайшоў у школу перадавы 4-ты клас, за ім астатнія класы. Новы будынак мае тры паверхі, светлыя прасторныя класы, вялікія калідоры, цэнтральнае ацапленне, піонерскі пакой, сталовую і т. д.

Усхваляваныя, разглядалі дзеці новую школу.

— Вялікія сталінскія клопаты аб нас,—гаварылі вучні паміж сабой.

КАСА УЗАЕМАДАПАМОГІ ДЛЯ ПЕНСІЯНЕРАЎ

У Беластоку ствараецца каса ўзаемадапамогі для пенсіянераў. Народны Камісарыят соцыяльнага забеспячэння БССР адпусціў на гэту мэту 10 тысяч рублёў.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

3 снежня, у 8 гадзін вечара, у памяшканні Дома Чырвонай Арміі адбудзецца агульнагарадскі вечар маладых выбаршчыкаў. У праграме вечара: даклад «Сталінская Канстытуцыя і совецкая моладзь», мастацкая частка. Уваход па білетах.

Беластоцкі гарком ЛКСМБ.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—114. Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластоцкдрук.